ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік галоўнага ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама
Р.Ю.Абрамчык
07.10. 2024

# І (ШКОЛЬНЫ) ЭТАП РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА” І “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА”

## Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры
## IX клас

*Кастрычнік 2024 г., Гродна*

| **Заданні** | **1** | **2** | **3** | **4** | **5** | **6** | **7** | **8** | **9** | **10** | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |
| **Подпіс члена журы** | | | | | | | | | | | |

**Заданне 1.** Запішыце словы (спалучэнні слоў) у фанетычнай транскрыпцыі.

*Максімальная колькасць балаў – 5*

| Словы | Транскрыпцыя |
|---|---|
| 1) перад хатай | |
| 2) ва Уруччы | |
| 3) клятчатка | |
| 4) да Ігната | |
| 5) яечня | |

**Заданне 2.** Ад прапанаваных словазлучэнняў утварыце складаныя прыметнікі.

*Максімальная колькасць балаў – 5*

| *Узор. розныя галасы* | *рознагалосы* |
|---|---|
| вострая сатыра | |
| дробны маштаб | |

| | |
|---|---|
| тонкія бровы | |
| глыбокія думкі | |
| просты народ | |

**Заданне 3.** Падкрэсліце ў сказах фразеалагізмы з кампанентам *розум* і патлумачце іх сэнс.

*Максімальная колькасць балаў – 5*

| Сказы | Тлумачэнне |
|---|---|
| 1. Як на добры розум, трэба было пачакаць якой паўгадзіны, пакуль не растане град *(У. Шахавец).* | |
| 2. Ці ў сваім ты розуме? Хто гэта садзіць бульбу ў скрынках? Гэта ж не расада якая… *(А. Якімовіч)* | |
| 3. Чаго вы чапляеце хлопца!.. Дайце яму жыць сваім розумам *(І Шамякін).* | |
| 4. Але мужык заўсёды заднім розумам хітры, – праўда, Шчасны? – звярнуўся да вартаўніка Войцік *(М. Машара).* | |
| 5. І дзе ні пойдзе Іванка, – людзі там розуму ад яго набіраюцца ды з ліхімі панамі змагаюцца *(А. Якімовіч).* | |

**Заданне 4.** Папрацуйце карэктарам, у сказах знайдзіце словазлучэнні з памылкай у дапасаванні або кіраванні. Запішыце правільны варыянт ужывання словазлучэнняў.

*Максімальная колькасць балаў – 5*

1) Волька нікому не паскардзілася: не хацела, каб над ёю смяяліся людзі. ____________________________________________________________

2) Андрэй, іх адзіны сын, закахаўся і павінен быў ажаніцца на Верачцы.

______________________________________________________________________

3) Дзве дзявочых постаці мільганулі за плотам.

---

4) Выбачайце нас, калі ласка, за спазненне.

---

5) Ноччу Ніначка захварэла, давялося пасляць за доктарам.

---

**Заданне 5.** Ад прапанаваных слоў утварыце новыя пазначаным спосабам.

*Максімальная колькасць балаў – 5*

| 1. Прыставачна-суфіксальным | 2. Суфіксальным |
|---|---|
| а) дах – | а) гітара – |
| б) сцяна – | б) скрыпка – |
| в) колер – | в) цымбалы – |
| г) надворак – | г) дуда – |
| д) сядзіба – | д) барабан – |

**Заданне 6.** Дапамажыце прадпрымальніку аформіць стэнд на беларускай мове са сваімі вырабамі.

*Максімальная колькасць балаў – 5*

| Назва прадукцыі па-руску | Пераклад |
|---|---|
| комод “Антарио” | |
| шкаф “Шекспир” | |
| диван “Юпитер” | |
| зеркало “Токио” | |
| сундук “Секрет” | |

**Заданне 7.** Беларуская мова ўпарадкавана так, што мы не можам абысціся без службовых слоў, якія выконваюць дапаможную функцыю. Паэтам і пісьменнікам, ды і проста карыстальнікам мовы іншы раз неабходна перадаць шум ветру, стракатанне коніка, клёкат бусла. На дапамогу прыходзяць гукаперайманні.

*Максімальная колькасць балаў – 5*

1. Янка Купала ў вершы “Кароль”, каб стварыць сюжэтны малюнак выкарыстаў шэраг гукаперайманняў. Ваша задача ўзнавіць каму належаць тыя ці і ншыя гукі.

Толькі часам мм-у, мм-у! –
Замычыць ______________________;
Бэ-э, мэ-э! Бэ-э, мэ-э! –
Забляе ________________________.

Рох-рох, цох-цох! Кві-кві, кві-кві! –
Пісьне ________________________,
Ды гі-гі-гі? – адыржэцца
Недзе ________________________.
……………………………………………………
Куку-куку! Куку-куку! –
Кукуе ____________________________;
Піць-піць! Піць-піць! – ____________________________ кліча,
Як бы после гуляў.

Ву-ву! Ву-ву! – загудзеў __________________
Каля вуха смела;
Ззынь-ззынь! Ззынь-ззынь! – з мёдам з кветкі
________________________ зазвінела.

2. Запішыце беларускамоўны адпаведнік англійскага гукаперайманння cock-a-doodle-doo __________________________________________

**Заданне 8.** Расстаўце, дзе патрэбна, знакі прыпынку. Запішыце, чым ускладнены кожны сказ.

*Максімальная колькасць балаў – 5*

1. Мой лепшы сябар Косцік займаецца ў спартыўным клубе. _________
_____________________________________________________________
2. Спякота прымусіла нас нарэшце схавацца ў цяньку. ______________
_____________________________________________________________
3. Эх час касьбы вясёлы час! І я з ім цешыўся не раз.
_____________________________________________________________
4. Міхал навошта ўжо таіцца? любіў-такі павесяліцца. ______________
_____________________________________________________________
5. Дзесьці высока-высока, за самымі хмарамі, курлыкалі журавы. ___
_____________________________________________________________

**Заданне 9.** Разгедзьце фотаздымкі пісьменнікаў. Устанавіце адпаведнасць паміж фотаздымкамі, аўтарамі, іх творамі. Адказ запішыце.

*Максімальная колькасць балаў – 5*

| | | |
|---|---|---|
|  1 | А. “Страта” | З. Генадзь Пашкоў |
|  2 | Б. “Казкі жыцця” | К. Васіль Быкаў |
|  3 | В. “Шчасце” | Л. Якуб Колас |
|  4 | Г. “Пахне чабор” | М. Максім Танк |
|  5 | Д. “Пазвоніць аднойчы вясна…” | Н. Пятрусь Броўка |

АДКАЗ: 1________; 2________; 3_________; 4________; 5________

**Заданне 10.** Адкажыце **так** або **не** на пытанні віктарыны “Літаратурны Гродна”

*Максімальная колькасць балаў – 5*

1) Гродзенская паэтка Алена Руцкая нарадзілася на Слонімшчыне. ____________________

2) У Гродна ёсць помнік Янку Купалу. ____________________

3) Уладзімір Караткевіч працаваў у газеце “Гродзенская праўда”. ____________________

4) Абласная бібліятэка носіць імя Івана Насовіча. ____________________

5) Янка Брыль нарадзіўся на Карэліччыне, працаваў у раённай газеце ў Міры. ____________________

6) Васілю Цяпінскаму пастаўлены помнікі ў Лідзе. ____________________

7) У 1775-1802 гг. у г. Гродна дзейнічала “Каралеўская друкарня”, яе уладальнікам быў Антоній Тызенгаўз? ____________________

8) У цэнтры г. Гродна ёсць дом-музей Максіма Багдановіча. ____________________

9) Васіль Быкаў у Гродна пражыў 25 гадоў. ____________________

10) Кінастужку па творы Міхася Лынькова “Міколка-паравоз” здымалі ў г.Гродна. ____________________